# Усё пачалося з мары. І кнігі…

У Год якасці і 100-гадовага юбілею Бярэзінскага раёна наша бібліятэка распачала новы творчы праект — «Землякі са знакам якасці». У планах — расказаць пра многіх, кім ганарыцца наша зямля, аднак першай была вечарына-прысвячэнне знакамітым жанчынам: з 12 яркіх ураджэнак Бярэзіншчыны гераінямі абралі дзвюх.



Роза Адамаўна Сярмяжка-Зінава — дзяўчынка з простай сялянскай сям’і, з вёсачкі Старая Князеўка — яшчэ са школы марыла стаць геолагам. У 1953 годзе паехала паступаць у Ленінградскі ўніверсітэт. Медалісты ў той час і там экзамены не здавалі, з імі праводзілі гутарку. Пры адказах на пытанні выпускніца беларускамоўнай школы не-не ды ўжывала тэрміны, словы з роднай мовы, тут жа, сама перакладала іх на рускую і трымалася вельмі ўпэўнена, бо адчувала, што веды, атрыманыя школе, ніколькі не горшыя, чым у іншых…

Пасля атрымання дыплома (прычым з адзнакай!) маладога спецыяліста запрашалі на работу ў Ленінградскі інстытут геабатанікі, аднак дзяўчына сама выбрала адзін з самых далёкіх пунктаў Савецкага Саюза — Караганду. І потым, калі можна так казаць, паставіла асабісты рэкорд: прайшла ў экспедыцыях ад Ціхага акіяна да Балтыйскага мора.

Дваццаць доўгіх гадоў геолаг Роза Сярмяжка-Зінава была далёка ад Беларусі, не чула роднага слова. Каб не забыцца яго, выпісвала часопіс «Беларусь», чытала, часта ўслых, для свайго мужа — рускага па нацыянальнасці, а неяк…

Лёсавызначальным стаў для жанчыны Міжнародны сімпозіум па геалогіі і фаўне Еўропы, дзе пашчасціла пазнаёміцца з беларускім акадэмікам і вялікім патрыётам Гаўрылам Іванавічам Гарэцкім. Менавіта ад яго Роза Адамаўна пачула мудрае: «Беларус павінен працаваць у Беларусі».

Час і сапраўды расставіў акцэнты: абараніўшы дысертацыю, і «зматаўшы ў клубок дарогі», яна прыйшла працаваць у Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР, выкладаць — па-беларуску — геаграфію ў сталічных школах. Нямала паездзіўшы па свеце, Роза Адамаўна пераканалася: найлепшае месца на зямлі тое, дзе ты нарадзіўся, найлепшыя пахі — лесу і сушаных грыбоў.

15 лютага нашай шаноўнай зямлячцы спаўняецца 89 гадоў.

...Шлях ад участковага педыятра да кіраўніка Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра прайшла ўраджэнка Беразіно доктар медыцынскіх навук, дацэнт Элеанора Кузьмінічна Капітонова. Стажыравалася ў найлепшых клініках Савецкага Саюза і за мяжой. Дасканалае валоданне англійскай мовай дазваляла ёй лёгка кантактаваць з калегамі на прэстыжных сімпозіумах, выступаць з лекцыямі на міжнародных сесіях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Пра яе зняты дакументальны фільм, біяграфія прадстаўлена ў энцыклапедыі «Хто ёсць хто ў Беларусі»…

А пачалося ўсё з... кнігі. У восьмым класе ў рукі дзяўчынцы трапіў раман Юрыя Германа «Справа, якой ты служыш» і…

Выбар быў зроблены: толькі медыцына.

Першая прыступка да прафесіі — Гродзенскі медінстытут, дзе яна паспявала і выдатна вучыцца, і ўзначальваць камсамольскую арганізацыю, другая — кандыдацкая дысертацыя, прадстаўленая на Усесаюзны конкурс навукова-даследчых работ маладых вучоных і адзначаная прэміяй АН СССР. Далей — пасады першага прарэктара Гомельскага медінстытута, першага дырэктара РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека…



Ужо на заслужаным адпачынку Элеанора Кузьмінічна ўзначаліла першы і адзіны ў Беларусі інфармацыйна-асветніцкі цэнтр аздараўленчага харчавання і садзейнічання здароўю.

...Інтэлігентная сталічная дама і сёння радуецца кожнаму пражытаму дню: пад гітару спявае рамансы (музыка — добры лекар), піша вершы (гімнастыка для душы), штодзённа ў любое надвор’е праходзіць 6–10 кіламетраў.

...Відавочна: бярэзінскай моладзі ёсць на каго раўняцца і з каго браць прыклад. Мы, супрацоўнікі бібліятэкі, стараемся дапамагчы ім выбраць годныя арыенціры.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ